


ЗГОДА

**ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК**
выдаецца з чэрвеня 1992 г.
выдавец **ІП КАРОЛЬ** А.С.
www.zgoda-weekly.net
**№31 (392)**
надрукованы ў пятніцу 2 верасня **2005 ГОДА**

# СКАРЫНЕ ЗНАЙШЛІ МЕСЦА

ГАННА БЕРГА

1 верасня — так абазначаны тэрмін здачы аб'екта «Нацыянальная бібліятэка». Хаця і пасля Дня ведаў трапіць у бібліятэку чытачу будзе нельга. На думку спецыялістаў, аддзелачныя работы расцягнуцца яшчэ як мінімум на паўгода.

**НАГАДАЕМ**

Міжнародны конкурс на праект Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі быў абвешчаны ў апошні год існавання СССР. У конкурсе бралі ўдзел многія мэтры. Але вельмі паважанае міжнароднае журы лепшым палічыла твор архітэктараў Вінаградава і Крамарэнкі *«за найбольш вобразнае архітэктурнае і тэхналагічнае рашэнне»*.

Віктар Уладзіміравіч і Міхаіл Кліменцьевіч — вельмі таленавітыя людзі. Дастаткова, мабыць, сказаць, што новы мінскі чыгуначны вакзал збудаваны па іх праекце.

Таленавітыя і сумленныя архітэктары проста абавязаны апярэджваць свой час на цэлае пакаленне, інакш іх твор састарэе яшчэ на стадыі праектавання.

*Заканчэнне на стар. 11*



